# Захавальніца рарытэтаў: да 70-годдзя Таццяны Іванаўны Рошчынай



Беларуская культура мае свае знакавыя імёны ў кожнай галіне. Заўжды больш на слыху музыкі, пісьменнікі, мастакі, акцёры… Бібліятэчны свет тут часта незаслужана застаецца ў цяні. Але гэта не значыць, што ў ім няма сваіх сапраўды бліскучых постацей.

18 чэрвеня 2019 г. 70 гадоў споўнілася Таццяне Іванаўне Рошчынай – заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь, выдатнай даследчыцы беларускай кніжнасці, якая больш за чатыры дзесяцігоддзі жыцця аддала справе фарміравання і захавання нацыянальнай кніжнай спадчыны.

Таццяна Іванаўна нарадзілася ў Мінску ў 1949 г. Атрымала вышэйшую адукацыю ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Максіма Горкага па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія». У 1970 г. пачала працаваць у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І. Леніна, спачатку ў аддзеле беларускай літаратуры, потым у аддзеле замежнай літаратуры. З 1983 па 2003 г. была загадчыкам аддзела рукапісаў, рэдкай кнігі і старадрукаў, пасля да 2016 г. працавала бібліёграфам у навукова-даследчым аддзеле кнігазнаўства.

Т.І. Рошчына з'яўляецца ўнікальным знаўцам гісторыі кніжнай культуры, адным з найлепшых у краіне спецыялістаў у галіне кнігазнаўства, аўтарытэтным прафесіяналам у рабоце з кніжнымі помнікамі. Яна зрабіла вельмі шмат для фарміравання каштоўнай калекцыі рукапісаў і старадрукаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і на працягу 20 гадоў узначальвала працу з рукапіснай, старадрукаванай і рэдкай кнігай у галоўнай бібліятэцы краіны. Дзякуючы яе намаганням фонды бібліятэкі папоўніліся шматлікімі кніжнымі помнікамі XVI–XIX стст. Таццяна Іванаўна прыклала шмат высілкаў для арганізацыі працы па вывучэнні і бібліяграфічным апісанні гэтай каштоўнай калекцыі, бібліяграфічнай рэканструкцыі беларускіх гістарычных кнігазбораў.

Пад кіраўніцтвам і пры актыўным удзеле Т.І. Рошчынай рэалізаваны праекты, якія спрыялі развіццю міжнароднага супрацоўніцтва і міжкультурнага ўзаемадзеяння ў галіне кніжнай справы. Разам з расійскімі, украінскімі, літоўскімі і польскімі калегамі ажыццёўлена бібліяграфічная і віртуальная рэканструкцыя кнігазбораў Радзівілаў, Сапегаў і Храптовічаў. Таццяна Іванаўна выступіла арганізатарам і ўдзельнікам шматлікіх міжнародных канферэнцый, у тым ліку Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, якія штогод праводзяцца ў Мінску з 1998 г. і збіраюць зацікаўленых навукоўцаў з усяго свету.

Па ініцыятыве Т.І. Рошчынай была распрацавана Дзяржаўная праграма «Памяць Беларусі», закліканая забяспечыць дзяржаўны ўлік і захаванне помнікаў кніжнай культуры краіны як часткі Міжнароднай праграмы ЮНЕСКА «Памяць свету». Музей кнігі, створаны ў 2006 г. у новым будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, таксама ў значнай ступені абавязаны сваім з'яўленнем Т.І. Рошчынай.

Уражвае колькасць і высокая навуковая якасць апублікаваных вынікаў плённай працы Таццяны Іванаўны. Гэта больш за 200 навуковых публікацый у айчынным і замежным друку, у тым ліку ў энцыклапедычных выданнях. Яна выступіла ініцыятарам стварэння, складальнікам і навуковым рэдактарам шматлікіх друкаваных выданняў па кнігазнаўстве, у тым ліку зборнікаў навуковых артыкулаў «Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі» (выдаецца штогод з 1995 г.) і «Рэха беларускіх кнігазбораў: лёсы прыватных бібліятэк» (2018), фотаальбома «Рарытэты Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі» (2005), метадычнага выдання «Кніжныя помнікі: выяўленне, апісанне, захоўванне, выкарыстанне» (2013), шэрага бібліяграфічных паказальнікаў і каталогаў калекцый.

Заслугі Т.І. Рошчынай былі неаднаразова ацэнены на дзяржаўным узроўні. Сярод яе ўзнагарод – Грамата Вярхоўнага Савета БССР за поспехі ў арганізацыі бібліятэчнай работы (1982), Ганаровая грамата Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (2009), медаль Францыска Скарыны (1990), нагрудны знак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад ў развіццё культуры Беларусі» (1999), ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь» (2013).

Таццяна Іванаўна – чалавек высокай духоўнасці і адказнасці за будучыню беларускай культуры. Яе праца спрыяла станаўленню і развіццю адметнай нацыянальнай кнігазнаўчай школы. Яна і сёння актыўна займаецца навукова-даследчай дзейнасцю, удзельнічае ў канферэнцыях, навуковых праектах, рыхтуе да друку навуковыя артыкулы. Т.І. Рошчына мае высокі аўтарытэт у міжнароднай кнігазнаўчай супольнасці, карыстаецца вялікай любоўю і пашанай у родным працоўным калектыве. Яе прафесіяналізм, выключная даследчыцкая руплівасць у спалучэнні з высокай адказнасцю за справу нязменна захапляюць і натхняюць беларускіх кнігазнаўцаў і не даюць апускаць планку навуковага ўзроўню працы.

Шчыра віншуем Таццяну Іванаўну Рошчыну з юбілеем і зычым моцнага здароўя, плённай працы, мноства цікавых знаходак і каштоўных здабыткаў на ніве беларускага кнігазнаўства!

***Калектыў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі***